составляющую как наиболее значимую в долгосрочной перспективе. Ведь все инновации, в любой сфере общественной жизни, в конечном счете, замыкаются на человека, и их успех, или же, наоборот, неуспех, будут непосредственно зависеть от человека.

Философам предстоит разработать концепцию человека как субъекта и объекта социального проекта «Беларусь интеллектуальная». В ней исследование феномена человека должно быть органично сопряжено с возможной траекторией развития Беларуси в ближайшие два десятилетия и в то же время осмысление этой траектории – получить преломление через конкретное бытие индивидуума с учетом его ценностей, установок и целей, возросшей его ответственностью как «человека мыслящего» и главного субъекта современных общественных процессов.

**Литература:**

1. Стратегия «Наука и технологии: 2018–2040». – Минск, 2017. – 41 с.

## *ПЕРАДУМОВЫ І МАГЧЫМАСЦІ ГЕАПАЛІТЫЧНАГА ЎПЛЫВУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ НА ЕЎРАПЕЙСКІЯ ПРАЦЭСЫ*

Часноўскі М. Э.
заведующий кафедрой международных отношений БГУ
(г. Минск), доктор исторических наук, профессор

Рэспубліка Беларусь – не звышдзяржава, нават не рэгіянальны лідэр. Яна можа іграць на міжнароднай арэне толькі ў камандзе. Еўрапейская прастора – найбольш прыдатная для праяўлення геапалітычнай актыўнасці краіны. Згаданая дзейнасць прыносіць рэальныя, а часам віртуальныя вынікі. Такая па вызначэнні логіка рэалізацыі геапалітычных прыярытэтаў. Віртуальны вынік таксама нельга лічыць бессэнсоўным ці маючым нулявы эфект. Ён дае вопыт знешнепалітычнай дзейнасці, застаўляе манеўраваць на знешнім полі, шукаючы больш прыдатныя варыянты рэалізацыі нацыянальных мэтаў. Належыць толькі пазбягаць канфрантацыі з

моцнымі актарамі, што вядуць да непапраўных геапалітычных вынікаў. Уласцівая сучаснай Беларусі разнастайная мазаіка ініцыятыў па еўрапейскай праблематыцы – сведчанне пэўнай актыўнасці краіны. Нельга пагадзіцца з павярхоўнымі меркаваннямі аб маргінальнасці Рэспублікі Беларусь на еўрапейскай арэне. Аднак арсенал метадаў і сродкаў геапалітычнага ўплыву Беларусі на еўрапейскія працэсы істотна абмежаваны і вымагае карэкціроўкі.

Беларусі, як дзяржаве з абмежаванымі геапалітычнымі магчымасцямі, неўласціва выкарыстоўваць "жорсткую сілу". Міжнародная практыка паказвае, што ў такіх сітуацыях практычна любой краіне – беларускаму аналагу – прыходзіцца лавіраваць, каб не скаціцца ў канфрантацыю з тым ці іншым знешнім апанентам. Яркі прыклад: пазіцыя афіцыйнага Мінска па пытанні прыналежнасці Крыма. Факт, што Беларусь так і не прызнала далучэнне Крыма да Расіі на афіцыйным узроўні, выглядае апраўданым. Яшчэ ў сакавіку 2014 г. Прэзідэнт А. Лукашэнка сказаў, што Крым сёння – гэта частка тэрыторыі Расійскай Федэрацыі, і нічога не зменіцца ад таго, прызнае гэта хтосьці ці не. Згаданая заява і лягла ў аснову беларускай пазіцыі па дадзеным пытанні. Мінск прызнаў факт далучэння паўвострава да Расіі, і толькі фармальна заяўляе аб сваёй нейтральнай пазіцыі па дадзеным пытанні. Відавочна, не жадаючы абвастраць адносіны з Захадам. Такое геапалітычнае манеўраванне нічуць не шкодзіць нацыянальным інтарэсам Беларусі.

У сучасных міжнародных рэаліях узнікаюць абставіны непераадольнай сілы – крызісы, канфлікты, масавыя выступленні, хаос і да т. п. Захаванне нацыянальнай бяспекі ў такіх абставінах вымушае дзяржаву прымяняць сілавыя метады, істотнай састаўляючай якіх выступае іх інфармацыйная падтрымка. Такія інфармацыйныя аперацыі ў сукупнасці з выкарыстаннем узброеных сродкаў, спецыяльна арыентаваных дзеянняў грамадскіх інстытутаў, прапаганды ў СМІ, мер палітыка-дыпламатычнага, фінансава-эканамічнага, культурнага, спартыўнага, дзелавога, навукова-асветніцкага зместу атрымалі назву "гібрыдных войн". Апошнія сталі стрыжнем палітыкі "мяккай сілы".

Як у любой вайне, у гібрыднай ёсць агрэсар і ахвяра. Рэспубліка Беларусь з пункта погляду свайго геапалітычнага патэнцыялу, з

улікам дактрыны нацыянальнай бяспекі абвяргае выкарыстанне метадаў “гібрыднай вайны”, а значыць – палітыку “мяккай сілы”. А вось для інфармацыйнага процідзеяння геапалітычным канкурэнтам, скіраваўшым супраць нас сродкі “гібрыднай вайны”, краіна павінна быць гатовай.

Аптымальны варыянт выкарыстання Беларуссю свайго ўплыву ў міжнародных адносінах – стратэгія “разумнай сілы”. Як вядома, яна склалася ў свеце ў выніку эканамічнай глабалізацыі і ўтварэння яе прадукта – суперкангламерата, складзенага з групы фінансава-крэдытных і транснацыянальных карпарацый, валодаючых львінай доляй сусветнага “эканамічнага пірага”. Суперкангламерат дае прастор ініцыятыве не толькі дзяржавам-гігантам, але і тэхналагічна прасунутым сярэднім і малым краінам, якія здольны манеўраваць “разумнай сілай” *(“smart power”)* як сінтэзам “жорсткай” і “мяккай”.

Стратэгія “разумнай сілы” – найбольш верагодны бонус для росту еўрапейскай значнасці Беларусі. Краіна валодае яе неабходнымі складнікамі, каб павышаць уласную эфектыўнасць, здольнасць да стратэгічнага выбару і манеўру, выгаднай інтэграцыі з сусветнымі цэнтрамі – нават незалежна ад сваёй геапалітычнай вагі. Выпрацаваўшы і ўдала апрабіраваўшы стратэгію “разумнай сілы”, Рэспубліка Беларусь здолее праводзіць “сваю лінію” міжнародных паводзін (стратэгію роўнааддаленасці ад блокаў, кааліцый, звышдзяржаў), што адпавядае выбранаму курсу на дасягненне нейтралітэту.

Патэнцыял “разумнай сілы” Беларусі сканцэнтраваны ў магчымасцях развіцця IT-індустрыі, лічбавай эканомікі, рынкавых адносін, геаэканамічнага манеўравання, у наяўнасці сучаснага навукова-інтэлектуальнага кадравага сегмента. Бачыцца абсяжны спектр крокаў краіны дзеля павышэння ўласнага геапалітычнага ўплыву, росту рэгіянальнага аўтарытэту з іх дапамогай, у прыватнасці:

– аздараўленне дэмаграфічнай сітуацыі, што павысіць геапалітычны патэнцыял Беларусі і яе прыцягальнасць для якаснай іміграцыі;

– умацаванне энергетычнай бяспекі беларускай дзяржавы;

– структурная, інтэлектуальная і тэхналагічная мадэрнізацыя нацыянальнай інфармацыйнай прасторы;

– актуалізацыя здольнасцей інфармацыйнай бяспекі Рэспублікі Беларусь;

– удасканаленне нацыянальнай сістэмы інтэлектуальнай уласнасці як шлях павышэння аўтарытэту краіны ў гуманітарнай сферы;

– нацыянальна-палітычная кансалідацыя як сродак збліжэння ментальнай арыентацыі беларусаў, геапалітычнай устойлівасці дзяржавы і здольнасці падцягвацца да ўзроўню перадавых краін свету;

– павышэнне ўплыву беларускай мовы як фактара нацыянальнай кансалідацыі і пераўтварэння ўнутранага свету беларускай нацыі;

– гарманізацыя стану рэгіянальнай гістарычнай самасвядомасці беларусаў.

У каардынаты "разумнай сілы" ўпісваецца ўдзел дзяржавы ў знешнепалітычнай каманднай гульні. У апошнія гады тут здзейснены даволі эфектыўныя крокі. Варта нагадаць ініцыятыўную ролю Мінска ў наладжванні перамоў па вырашэнні крызісу ва Украіне, прасоўванне ініцыятывы "Хельсінкі -2", прапановы развіцця больш цеснага ўзаемадзеяння паміж еўрапейскім і еўразійскім інтэграцыйнымі працэсамі.

Асноўнай геапалітычнай асаблівасцю Рэспублікі Беларусь у сістэме еўрапейскіх адносін з'яўляецца тое, што яна вымушана практычна гуляць у дзвюх камандах, прычым па цалкам адрозных "нотах", паколькі размешчана паміж канфрантацыйнымі палюсамі (Расіяй і Еўрасаюзам) і мае з імі асіметрычныя адносіны. Стрыжань эфектыўнасці беларускай геапалітычнай лініі: знайсці баланс ва ўзаемадзеянні з Расійскай Федэрацыяй і Захадам, прадухіліць магчымасць развіцця паталагічных форм Саюза Беларусі і Расіі (аж да паглынання Беларусі), уключэння Масквой уласных рэінтэграцыйных козыраў, пераважна эканамічных і культурна-цывілізацыйных. Мінску важна, каб падтрымка з боку ЕС не разбурала яўным чынам саюзныя адносіны паміж Беларуссю і Расіяй. Любы адваротны варыянт – непажаданы; апрача ўсяго, ён у некалькі разоў павысіў бы нестабільнасць у рэгіёне ЦУЕ.

Як рэзюмэ, адзначым: і ЕС, і Расія ўспрымаюць Беларусь як краіну, маючую пэўны геапалітычны патэнцыял, здольны ўплываць на еўрапейскія працэсы. Але крокаў афіцыйнага Мінска пакуль мала, каб павысіць еўрапейскую вагу дзяржавы, бадай дастаткова толькі, каб захаваць тое, што ёсць. Для павышэння ўплыву краіне патрэбна стратэгія "разумнай сілы" – не ранейшая імітацыя дыялога з Захадам, а сапраўднае супрацоўніцтва па праблемах удасканалення палітычнай сістэмы дзяржавы, нацыянальна-палітычнага аздараўлення, умацавання нацыянальнай інфармацыйнай прасторы і прадуманая тактыка кампрамісаў, пазбягання канфрантацыі з галоўнымі цэнтрамі сілы ў Еўропе. Афармленне стратэгічнага партнёрства з КНР будзе своеасаблівай падстраховачнай палітычнай падушкай на выпадак крызісаў, дасягненнем класічнай геапалітычнай формулы для любой малой і сярэдняй краіны: мець двух і больш моцных партнёраў, на якіх можна абаперціся, каб пашыраць магчымасці знешнепалітычнага манеўра.

## *СОЦИАЛЬНО-ПОЛИТИЧЕСКИЕ ИЗМЕНЕНИЯ В БЕЛАРУСИ В ПОСТСОВЕТСКИЙ ПЕРИОД*

Бущик В. В.
доктор политических наук, профессор, БГПУ (г. Минск)

В условиях политических и социально-экономических преобразований в обществе объективно возрастает интерес к социальному наследию, к современным теориям и концепциям общественного развития. Теоретическое осмысление опыта осуществленных преобразований способствует разработке эффективной социальной политики, на основе которой решаются задачи стабилизации и экономического роста.

Преобразования в политической сфере Республики Беларусь в постсоветский период развивались в направлении укрепления суверенитета страны. Во второй половине 1990-х гг. население Беларуси осознало государственный суверенитет как значимую ценность, мечту целого ряда поколений граждан, которые отстаивали незави-